# ЮБІЛЕЙНЫЯ ДАТЫ

## З ПАВАГАЙ І ЎДЗЯЧНАСЦЮ
## (да 70-годдзя з дня нараджэння А.І. Падлужнага )



Акадэмік НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар, да нядаўняга часу – дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа, выдатны вучоны, цікавы субяседнік, прыгожы мужчына – гэта ўсё ён – Аляксандр Іосіфавіч Падлужны, імя якога вядома не толькі спецыялістам-мовазнаўцам, але і ўсім тым, каго хвалююць праблемы ўнармавання сучаснай беларускай літаратурнай мовы і яе тэрміналогіі. Яго імя засведчана ў персаналіях рада энцыклапедычных даведнікаў: "Беларуская мова: Энцыклапедыя", энцыклапедыя "Літаратура і мастацтва Беларусі", "Беларуская энцыклапедыя".

16 жніўня 2005 года Аляксандр Іосіфавіч адзначае сваё 70-годдзе, якое ён сустракае з надзіва багатай навуковай скарбонкай, пра што сведчаць апублікаваныя ім звыш 120 навуковых прац, у тым ліку 15 кніг, сярод якіх такія грунтоўныя манаграфіі, як "Фаналагічная сістэма беларускай мовы", "Фанетыка слова ў беларускай мове", "Фанетыка беларускай літаратурнай мовы" і інш. Даследчык унёс значны ўклад у развіццё многіх раздзелаў і накірункаў сучаснага беларускага мовазнаўства, асноўныя ж напрамкі яго навуковай дзейнасці – гэта фанетыка і фаналогія, культура мовы, сацыялінгвістыка.

Нарадзіўся Аляксандр Іосіфавіч на Магілёўшчыне, у вёсцы Залессе, у сям'і калгаснікаў – Іосіфа Лявонавіча і Марыі Лазараўны Падлужных. У 1954 годзе закончыў Мсціслаўскае педвучылішча, а ў 1959 – аддзяленне беларускай мовы і літаратуры БДУ імя У.І. Леніна, пасля заканчэння якога працаваў у Раснянскай сярэдняй школе Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Але, адчуваючы ў сабе здольнасці да навуковай дзейнасці, у 1961 годзе А.І. Падлужны паступае ў аспірантуру пры Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі, дзе быў закладзены падмурак яго будучых навукова-даследчых дасягненняў.

Абароненая ў 1967 годзе кандыдацкая дысертацыя адкрыла маладому вучонаму шлях да новых даследаванняў, якія ён ажыццяўляе ў сценах Інстытута мовазнаўства. Тут А.І. Падлужны прайшоў шлях ад малодшага навуковага супрацоўніка да дырэктара інстытута. З 1982 года ён доктар філалагічных навук. За дасягненні ў навуцы і навукова-арганізацыйнай дзейнасці ў 1989 годзе абраны членам-карэспандэнтам, а ў 1994 – акадэмікам НАН Беларусі. З 1997 года – акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі. Займаючы высокія пасады ў сістэме акадэміі, Аляксандр Іосіфавіч працягвае займацца і навуковай дзейнасцю – напачатку ўзначальвае аддзел эксперыментальнай фанетыкі, а пазней – аддзел сучаснай беларускай літаратурнай мовы. А.І. Падлужны – член рабочай групы Міжнароднай камісіі "Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа", член Камісіі па фанетыцы і фаналогіі пры Міжнародным камітэце славістаў.

Юбіляр прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі, пад яго кіраўніцтвам абаронена каля дзесятка кандыдацкіх дысертацый, у

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

тым ліку і навуковае даследаванне аўтара гэтых радкоў. Аляксандр Іосіфавіч доўгі час узначальвае Савет па абароне дысертацый пры Інстытуце мовазнаўства, з'яўляецца членам Савета пры БДУ, рэгулярна выступае з лекцыямі перад студэнтамі, кіруе дыпломнымі работамі. Як член Дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы новых падручнікаў у гуманітарна-грамадазнаўчай сферы А.І. Падлужны займаецца рэцэнзаваннем практычных дапаможнікаў па беларускай мове для сярэдніх школ і ВНУ. Аляксандр Іосіфавіч узначальвае тэрміналагічную камісію НАН Беларусі, з'яўляецца адказным рэдактарам штогодніка "Беларуская лінгвістыка" і галоўным рэдактарам часопіса "Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук", членам рэдкалегіі энцыклапедыі "Беларуская мова" і 18-томнай "Беларускай энцыклапедыі".

Поспехі А.І. Падлужнага ў навуковай дзейнасці неаднаразова адзначаліся ганаровымі граматамі Прэзідыума НАН Беларусі. У 1983 годзе ён узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, у 1986 – ордэнам "Знак Пашаны", а ў 1999 годзе яму прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь.

З юбілеем Вас, шаноўны Аляксандр Іосіфавіч! Моцнага Вам здароўя, натхнення і плёну на навуковай ніве і ў паўсядзённым жыцці.

Д.А. ЛАЎШУК,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускай мовы
МДУ імя А.А. Куляшова.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова